■ «Славянскі базар-2013»

У ПРАМЫМ ЭФІРЫ

Трансляцыю асноўных мерапрыемстваў XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску-2013» пакажуць тэлеканалы Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. Сёлета ў эфіры «Беларусь 1», «Беларусь 3», «Беларусь 24» і Беларускага радыё гледачы ўбачаць адкрыццё і закрыццё фестывалю, міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні і міжнародны дзіцячы музычны конкурс і іншыя мерапрыемствы папулярнага форуму.

Каналы «Беларусь 1» і «Беларусь 24» будуць транслíраваць урачыстае адкрыццё «Славянскага базару» 11 ліпеня, а закрыццё 15 ліпеня ў 22.00. Удзельнікамі іх стануць Эдзіта П'еха, Аляксандр Малінін, Алена Ланская, Дзіма Білан, Іна Афанасьева, Ларыса Доліна, Пётр Дранга, Ева Польна, Злата Огневіч і іншыя артысты. А 12 ліпеня ў 22.00 пакажуць у прамой трансляцыі «Канцэрт сяброўства. Саюзная дзяржава запрашае...». На сцэну Летняга амфітэатра выйдуць Яўген Гор, Руслан Аляхно, Іскуі Абалян, Методые Бужор, Марына Дзевятава, «Песняры», Алішэр Карымаў... Вядучымі вечара будуць Алена Спірыдовіч (Беларусь) і Арцём Камінскі (Расія).

Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі будзе асвятляць «Славянскі базар» у выпусках навін і падчас прамых уключэнняў. Арыентавацца ў падзеях дапамогуць дзённікі фестывалю «Славянскі базар у Віцебску-2013», праграма «Без каментарыяў», якія будуць выходзіць на «Беларусь 1» і «Беларусь 24» перад трансляцыяй канцэртаў. Жыццё фестывальнага Віцебска гледачы змогуць убачыць у рамках ранішняй праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!».

10-12 ліпеня Белтэлерадыёкампанія правядзе запіс XI Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2013». Гала-канцэрт і цырымонію ўзнагароджання пераможцаў можна будзе ўбачыць на тэлеканале «Беларусь 3» 20 ліпеня.

Традыцыйна актыўна асвятляць падзеі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» будзе і Беларускае радыё. Дзённікі, інфармацыйныя і музычныя праграмы запланаваны на Першым нацыянальным канале, канале «Культура», радыёстанцыях «Беларусь», «Сталіца» і «Радыус-FM». 11 ліпеня ў вячэрнім эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё можна будзе пачуць прамую трансляцыю канцэрта адкрыцця фестывалю. На працягу фестывальных дзён непасрэдна з Віцебска слухачоў будуць вітаць праграмы «Афіша», «Добры дзень», «Беларуская калекцыя», «Музычны алімп» і «Культурная прастора». Дзіцячаму конкурсу будзе прысвечана асобная праграма «Маладыя таленты Беларусі».

Алена ДРАПКО.

«БАЗАРНЫЯ» СТЭЛС І ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ ЛЯБЁДКІ

Сёлета, відаць, галоўная сцэнічная пляцоўка міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» стане насамрэч унікальнай у плане афармлення. Як раней паведамляла «Звязда», арганізатары «базару» паабяцалі шмат навінак на сцэне Летняга амфітэатра. І вось адбываецца «звычайны цуд».

Як паведамілі ў дырэкцыі фестывалю, больш за 20 чалавек з раніцы да позняга вечара (а калі трэба — і па начах) займаюцца мантажом абсталявання, якое прывезлі з Масквы аж на 10 грузавіках.

Сярод іншых, у амфітэатры працуюць прадстаўнікі кампаніі «Стэлс», якія займаюцца ўстаноўкай экранаў. Згодна з планам, усе неабходныя работы па мантажы элементаў афармлення і наладцы абсталявання на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы «базару» павінны быць завершаны за дзень да яго пачатку. Як і летась, падчас канцэртных праграм у амфітэатры будуць выкарыстаны так званыя «інтэлектуальныя» лябёдкі. У дырэкцыі гарантуюць, што сёлета тэлегледачы не пашкадуюць, калі ўключаць трансляцыю канцэртаў. «Карцінка» будзе не горшай, чым на «Еўрабачанні». Ды не, вядома ж — лепш!

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Смак лета

ЛЕТА. АГУРКІ. «КЕФІРНЫ СУП». ШЧАСЦЕ!

Патэлефанаваўшы мне на працу, мама паведаміла, што ўзяла ўжо зградкі 9 (!) сваіх агурочкаў. Ніколі так рана (быў канец чэрвеня) яны ў нас не вырасталі. Звычайна стараліся атрымаць першы ўраджай хаця б да трэцяга ліпеня — дня народзінаў майго брата. І тое не заўсёды было. А тут...

Прыйшоўшы на абед, найперш палезла ў халадзільнік па агуркі — палюбавацца і ўзяць для «кефірнага супу». Дастала агурочкі, панюхала, палюбавалася, два памыла, узяла ў рукі нож і... Думкі паплылі — не стрымаць.

Думаю, мяне зразумее кожны дачнік альбо гаспадар уласнай сядзібы (я зараз не пра вырошчванне ў прамысловых маштабах на продаж), калі скажу: са сваімі агуркамі куплёныя не параўнаюцца. Нават набытыя ў дбайнага гаспадара! Што ўжо казаць пра крамныя ці масава-базарныя... Свае — асаблівыя. З тонкім водарам. Салодкія. Іх, асабліва першыя, магу

есці ў любой колькасці. Проста так. Нават без солі. Затое з такой асалодай! М-м-м...

Неаднойчы ў дачны сезон назірала па прыездзе ў Мінск за тым, з якімі гонарам і годнасцю людзі ў амаль што працоўнай вопратцы з вялізнымі сумкамі ці заплечнікамі трымаюць... Тры падвялыя рамонкі. Букецік хрызантэм. Паўлітровы слоік трускалак ды іншае. Іх, тых людзей, не зблытаеш ні з кім — дачнікі! Толькі ў іх такая замілаванасць да вырашчанага. Няхай сабе немудрагелістага, невялікага, несамавітага нават, у малой колькасці. Але — вырашчанага сваімі рукамі, з вялікай пяшчотай і любоўю. І таму — асаблівага. Прынамсі, для іх. Такія назіранні заўсёды выклікаюць у мяне добрую ўсмешку. І я цудоўна разумею пачуцці гэтых людзей! Бо ў нашай сям'і таксама прынята любавацца-захапляцца малым як вялікім, калі яно вырашчана-сабрана сваімі рукамі.

А колькі разоў даводзілася перахопліваць жаласліва-пагардлівыя позіркі ўладальнікаў шыкоўных аўто, кінутыя на дачнікаў, якія, выходзячы з трамвая, таропка крочылі перад імі па пешаходным пераходзе, пяшчотна прыціскаючы да грудзей свае падвялыя рамонкі. «Ды я такіх кветак магу купіць цэлы вагон!» — здаецца, красамоўна гаварылі позіркі аўтаўладальнікаў. Не. Не можаце. ТАКІХ — ні за якую валюту! Розніцу ж можна адчуць, толькі ўклаўшы ў штосьці сваю душу...

Спадзяюся, «кефірны суп» хуткага прыгатавання вядомы многім. А калі не, дык вось самы просты яго рэцэпт. Рэжам, ссыпаючы ў талерку альбо керамічную міску, памідоры, агуркі, кроп, зялёную цыбулю (калі не трэба на працу альбо не баіцеся дыхаць на ўсіх). Рэжам, як каму падабаецца: квадрацікамі, прамавугольнікамі, маленькімі альбо вялікімі скрылікамі, а хто ўмее — кружочкамі накшталт канфеці (жартую!). Добра солім, заліваем да краёў кефірам з халадзільніка (эх, зноў вышэй беражка атрымалася, давядзецца, нахіліўшыся, сербануць!). Акуратна перамешваем. І — смачна есці! Халодненькае, свежанькае, крамяна-хрумсткае... М-м-м... А ў несусвет-

ную гарачыню — самае тое! Асабіста я рэзала ў стылі «як папала» — спяшалася.

...Перачытваю напісанае і пацІху п'ю гарбату з трох зёлак — святаянніку, чабору і мяты. Таксама адмысловая смаката. А якая карысць! Ніякі куплены чай не параўнаецца, хоць ужо шмат гадоў п'ю і яго — вядомай і досыць дарагой фірмы. Але гэтая гарбата...

Заплюшчваю вочы — і ў думках пераношуся на квяцісты луг. Ляжыш сярод зёлак, удыхаеш пах сена.... Зверху пяшчотна грэе (але не прыпякае!) чароўнае сонейка, у красках гудуць пчолы і чмялі (камароў, мух, аваднёў, а тым больш, барані Божа, кляшчоў ды іншай нечысці няма і знаку!), лёгкі ветрык заблытаўся ў смарагдавай траўцы... Вось яно — ШЧАСЦЕ!

... А пачыналася ж усё... з першага ўраджаю сваіх агуркоў!

Святлана АДАМОВІЧ.
Фота аўтара

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ПАМЯЦІ РАШАЛЬНІКА, СКЛАДАЛЬНІКА

На вялікі жаль, пайшоў з жыцця самы актыўны звяздоўскі рашальнік шашачных задач, эцюдаў і камбінацый і іх складальнік Уладзімір Максімавіч Сапяжынскі *(на фота)*: 1 лістапада ён святкаваў бы сваё 65-годдзе з дня нараджэння. Кандыдат у майстры спорту з Рагачова меў самы высокі рэйтынг у спаборніцвах рашальнікаў: чатыры разы заваёўваў званне чэмпіёна Беларусі і з'яўляўся шматлікім лаўрэатам рэспубліканскіх конкурсаў. Браў ён тым, што знаходзіў у пазіцыях поўныя альбо прыватныя разгалінаванні; даказваў, што некаторыя не развязваліся, і зарабляў дадатковыя ачкі. А як складальнік быў бронзавым прызёрам ЧРБ-16 у раздзеле «Эцюды-100». Лепшая памяць аб ім — яго адметныя творы. Адзін з іх прапануем вашай увазе:

Белыя: b4, c5, e1, e3 (4). **Чорныя:** a3, a7, e5, e7, g7 (5). Задачная міні-праблема: 1. cb6 a7:c5 2. b:h6 ab2 3. ed4 e:c3 4. hc1 ba1 5. cb2 cd2 6. e:c3#. Калі ж на c7 уладкаваць простую чорных, а на e5 паставіць простую белых, будзе 1. ed6! c:e5 2. cb6 і г. д. Аднак тады пасля 1. cd6 e:c5 2. b:b8 узнікае пабочная развязка, у чым пераканайцеся самі.

ЗАКЛЮЧНЫЯ ЗАДАННІ



Мы іх падаём у конкурсе «Пагода ў доме-9», які праводзім на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У абодвух белыя пачынаюць і выйграюць:

№9/23. **Белыя:** a1, b6, c5, c7, g3, g7(6). **Чорныя:** a3, a5, b2, c3, d4, d8, e3, h4(8).

№9/24. **Белыя:** b4, b6, c5, d6, e7, h6, дамка f8(7). **Чорныя**: a3, b2, b8, d2, f2, f4, g5, h8 (8).

А наступную пазіцыю разгледзьце па-за конкурсам:

Белыя: b2, b6, c1, c7, f6, g7, дамка f4(7). **Чорныя:** a5, b8, d4, d6, f2, дамкі e1, e5 (7). Таксама перамога белых.

АЎТАРСКІ-18



Яго працягвае мінчанін Віктар Шульга, які сёлета ўзначаліў Камісію па кампазіцыі ФМЖД:

№ 18/3. **Белыя:** d4, e1, f2, дамка f8 (4). **Чорныя:** d6, d8, e7, h2, h4 (5). Выйгрыш.

№ 18/4. **Белыя:** 24, 33, 34, 40, 42, 47, 50 (7). **Чорныя:** 13, 17, 23, 36, 38, 45 (6). Атака белых на сваю карысць.

♦♦♦

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

Рашэнні

Аўтарскі-18 (В. Шульга): **№ 1** — 2 (29AB) 16, 2x. A(22) 29x. B(43) 48, 30 (28CD) 2 (32) 7 (22) 11 (27) 16x. C(29) 2 (34) 7x. D(22) 2 (29) 7 (33) 16 (39E) 11x. E(28) 42x і **№ 2** — g5, c7, b6, b8, b8:g3:h6 (f2) g3, f4x.

«Пагода ў доме» (М. Грушэўскі): **№ 9/17** — g7 (f2A) c7 (d4) f8 (g5B) c1, e1x. B(c5) h4, a1x. A(g5) c7 (d4) f8 (f2C) e1x. C(c5) e1, a1x, **№ 9/18** — c3 (d2A) e3 (d2B) d8 (e5C) d8:h8x. C(e7) d8:h4:h8x. B(e7) d8, d8:h4:h8x. A(e7) d8, e3!, d8:h4:h8x і **№ 9/19** — B8, f8, g5, c7, c1 (a5/c5) c3x.

Даты | Падзеі | Людзі

1816 год — нарадзіўся Мацвей Лявіцкі, філосаф-дэмакрат, асветнік і публіцыст. Вучыўся ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, працаваў урачом у Коўне і Беластоку. Браў актыўны ўдзел у рэвалюцыйна-дэмакратычным руху і ў дзейнасці звязаных з ім тайных таварыстваў, якія абвяшчалі неабходнасць сацыяльна-палітычных змен у грамадстве і вялі асветніцкую работу сярод насельніцтва. У 1840 годзе арыштаваны і высланы ў Сібір. Супрацоўнічаў у часопісах «Звезда» і «Научно-литературный дневник», якія ў той час былі органамі прагрэсіўнай грамадскай думкі на тэрыторыі Украіны, Беларусі і Літвы. Лявіцкі ўнёс значны ўклад у развіццё філасофскай думкі і ў вучэнне пра грамадства і мараль. Яму былі блізкія і зразумелыя ідэі сацыяльнай справядлівасці і салідарнасці людзей працы, ідэі свабоды, гуманізму. Падтрымліваў пераважна пануючую ў той час у навуцы канцэпцыю паступовага і паслядоўнага развіцця, лічыў магчымым і рэвалюцыйны шлях пераўтварэння грамадства. Рашуча выступаў супраць пераваротаў і рэвалюцыі тыпу якабінскай дыктатуры за іх жорсткасць, антыгуманны характар. Падтрымліваў ідэю народаўладдзя і выкарыстання ўсёй паўнаты правоў чалавека. Аўтар прац «Нарыс духу Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі», «Варыяцыі», «Погляд на хрысціянскі свет» і іншых. Памёр у 1900 годзе.

1762 год — у гэты дзень Пётр III падпісаў маніфест аб адрачэнні ад прастолу. У выніку перавароту імператрыцай была абвешчана Кацярына II. А Пётр у суправаджэнні гвардзейцаў быў адпраўлены ў Ропшу за 30 вёрстаў ад Пецярбурга, дзе і загінуў пры нявысветленых абставінах. Новай імператрыцы з гатоўнасцю прысягалі не толькі палкі гвардыі, але і Сенат, Сінод. Кацярына з гадамі стала рускай патрыёткай, паверыла ў богаабранасць рускага народа і яго асаблівую місію. У аснове імперскай свядомасці ляжала перакананасць у праве Расіі — спадчынніцы Візантыі — распараджацца лёсамі іншых народаў. «Прынамсі, параўноўваючы ўсе вядомыя нам часы Расіі, ці не кожны з нас скажа, што час Кацярыны быў самым шчаслівым для грамадзяніна расійскага, — пісаў Карамзін. — Кожны з нас пажадаў бы жыць тады, а не ў іншы час». «Мяне абкрадаюць гэтак жа сама, як і іншых, — скардзілася імператрыца ў лісце да пані Б'елке ў 1775 годзе, — але гэта добры знак і паказвае, што ёсць што красці»...

1948 год — 65 гадоў таму нарадзіўся Вячаслаў Іванавіч Янчэўскі, беларускі матэматык, доктар фізіка-матэматычных навук (1981), прафесар (1990), член-карэспандэнт НАН Беларусі (2009). Аўтар навуковых прац па алгебраічнай геаметрыі, алгебраічнай K-тэорыі, групах Браўэра алгебраічных разнастайнасцяў і іх палёў функцый.

Было сказана

Вінцэнт ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ, драматург:

«Калі бяседа будзіць мілыя ўспаміны,
Дык момантам здадуцца вечара гадзіны».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Муза. Плотка. Апак. Ялец. Нал. Укос. Бот. Порт. Сава. Кар. Рулет. Рэклама. Рад. Сода. Кныр. Пералом. Лагуна. Парадак. Кед. Мангал. Рама. Раса. Таран. Ірга. Абакан. Комі. Вал. Лазурыт.

Па вертыкалі: Краснапёрка. Пак. Трыко. Егер. Руда. Кардан. Судак. Крама. Лама. Авал. Радно. Ітака. Пенс. Мінор. Кол. Праца. Грам. Ява. Папа. Ніл. Фал. Карп. Скнара. Балкон. Дар. «Дынама». Падуст. Твар. Кандыдат.

СЁННЯ

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 4.50	21.39	16.49
Віцебск	— 4.31	21.37	17.06
Магілёў	— 4.40	21.30	16.50
Гомель	— 4.45	21.17	16.32
Гродна	— 5.06	21.53	16.47
Брэст	— 5.16	21.45	16.29

Месяц

Маладзік 8 ліпеня.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. Георгія, Давыда, Дзяніса, Івана, Ціхана.
К. Веранікі, Зянона, Мікалая.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +24..+26°C	КІЕЎ +24..+26°C	РЫГА +21..+23°C
ВІЛЬНЮС +22..+24°C	МАСКВА +22..+24°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +21..+23°C

УСМІХНЕМСЯ

— І куды ты такі прыбраны?
— На спатканне!
— А чаму без кветак?
— А ў мяне трусы ў рамонак.

Асфальт — гэта такі матэрыял, якім пакрываюць дарогі і тратуары перад пачаткам земляных работ.

— Сухое віно будзеш?
— Насыпай...

Псіхалагічная несумяшчальнасць паміж мужчынам і жанчынай — гэта калі яе псіхіка не сумяшчаецца з яго логікай.

— Дзяўчына, а давайце згуляем у карты на распрананне?
— А давайце шчыра — вам цікава ўбачыць або пахваліцца?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 23.523. Індэкс 63850. Зак. № 3040.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 8 ліпеня 2013 года.